### *75 гадоў з дня нараджэння М. В. Кожуха (1950)*

**Кожух Мікалай Васільевіч** нарадзіўся 3 снежня 1950 г. у в. Старыя Пескі Бярозаўскага раёна. Закончыў Брэсцкі будаўнічы тэхнікум (1970), Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1980). Працаваў майстрам-будаўніком, інжынерам-гідратэхнікам саўгаса «Прагрэс» Бярозаўскага раёна (1970-1976), галоўным інжынерам ПМК-17 «Галоўпалессеводбуда» ў Кобрыне (1981-1989), кіраўніком, генеральным дырэктарам ААТ «Будтрэст № 33» у Кобрыне (1989-1998), старшынёй Кобрынскага гарадскога Савета дэпутатаў у 1998-2001 гг. Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.

**Кожух Мікалай Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 452-453. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

### *100 гадоў з дня нараджэння А. Ц. Конана (1925)*

**Конан Аляксандр Цімафеевіч** (1925-1988). Нарадзіўся 2 студзеня 1925 г. у в. Вераскава Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. У жніўні 1944 г. мабілізаваны ў Чырвоную армію ў 93 зенітны полк. У снежні 1945 г. у баях за Варшаву быў цяжка паранены і накіраваны ў шпіталь. У красавіку 1945 г. вярнуўся ў дзеючую армію ў 237 запасны стралковы полк, у лістападзе 1945 г. дэмабілізаваны. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, медалямі. У 1961 г. пераехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Кобрын.

**Конан Аляксандр Цімафеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 243 : фат. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *65 гадоў з дня нараджэння В. І. Корнева (1960)*

**Корнеў Віктар Іванавіч** (1960-1986). Старшы прапаршчык. Нарадзіўся 5 ліпеня 1960 г. у в. Дзевяткі Кобрынскага раёна. Вучыўся ў Рынкаўскай школе, у 1980 г. закончыў 11 класаў Кобрынскай завочнай школы. Прайшоў падрыхтоўку ў Брэсцкай школе ДТСААФ па спецыяльнасці вадзіцель аўтамашыны. У 1980 г. прызваны ў Савецкую армію і накіраваны ў групу савецкіх войскаў у Германіі. У 1982 г. пасля заканчэння школы прапаршчыкаў прызначаны камандзірам узвода і застаўся на звыштэрміновай службе. У лютым 1985 г. быў накіраваны ў Афганістан. У 1986 г. загінуў у час абстрэлу. Пахаваны

на могілках в. Тэўлі. У свой час імя В. Корнева было прысвоена піянерскаму атраду школы № 5 г. Кобрына. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна) і медалём.

**Корнеў Віктар Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 445 : фота. – (Загінулі ў Афганістане).

**Корнеў Віктар Іванавіч** (нар. 05.071960, в. Дзевяткі – 15.12.1986), старшы прапаршчык // Памяць. Афганістан. – Мінск, 1991. – С. 218.

### *115 гадоў з дня нараджэння В. В. Краўчук-Міцькінай (1910)*

**Краўчук-Міцькіна Вольга Васільеўна** (1910-1988). Нарадзілася ў 1910 г. у в. Турная Кобрынскага раёна. У жніўні 1941 г. разам з мужам Ц. М. Краўчуком уключылася ў барацьбу супраць акупантаў: збірала інфармацыю пра варожыя войскі, дастаўляла ў Кобрын лістоўкі са зводкамі Саўінфармбюро, узрыўчатку, міны, вяла агітацыю сярод ваеннапалонных. Пасля гібелі мужа ў красавіку 1944 г. В. В. Краўчук-Міцькіна разам з дзецьмі пайшла ў партызанскі атрад, была разведчыцай. Пасля вызвалення раёна ад фашысцкіх захопнікаў заснавала дзіцячы дом у Кобрыне і была яго загадчыцай. У 1946 г. пераехала ў Падмаскоўе. Памерла ў 1988 г., пахавана ў в. Турная.

**Краўчук-Міцькіна Вольга Васільеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002.- С. 222 : фат. - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *185 гадоў з дня нараджэння Ю. Ф. Крачкоўскага (1840)*

**Крачкоўскі Юльян Фаміч** (1840-1903). Беларускі і рускі этнограф, педагог, гісторык, старшыня Віленскай археаграфічнай камісіі. Нарадзіўся 25 ліпеня 1840 г. у в. Азяты Кобрынскага павета Гродзенскай губерніі. Крачкоўскі - аўтар прац па этнаграфіі Беларусі. Ён аўтар першага грунтоўнага даследавання пра радзінны абрад беларусаў і выхаванне дзіцяці «Нарысы быту заходнярускага селяніна» (1869) і фальклорна-этнаграфічнага зборніка «Быт заходнярускага селяніна» (1874), прысвечанага сямейным (пераважна вясельным) і каляндарна-аграрным абрадам беларусаў, у якім выкарыстаў больш за 300 фальклорных твораў. Ю. Ф. Крачкоўскі - складальнік 16 і 20 тамоў, аўтар прадмоў да іх і да 25 тома «Актаў Віленскай камісіі». Распрацоўваў методыкі педагагічнага выхавання ў навучальных установах. Памёр 25 ліпеня 1903 г.

**Крачкоўскі** Юльян Фаміч // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] – Мінск, 2012. – Т. 4. – С. 567.

**Крачковский** Юлиан Фомич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2007. – Т. 4. - С. 277.

**Саламевіч, І. У.** Крачкоўскі Юльян Фаміч / І. У. Саламевіч // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. – Т. 6. – С. 111.

**Цішчанка, І. К.** Крачкоўскі Юльян Фаміч / І. К. Цішчанка // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 470.

**Крачкоўскі Юльян Фаміч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С.76-79 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

### *85 гадоў з дня нараджэння У. Р. Кузіча (1940)*

**Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** нарадзіўся 23 лютага 1940 г. у в. Павіцце. Закончыў Брэсцкі педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна факультэт прыродазнаўства (1972). Працаваў намеснікам старшыні калгаса імя Чкалава (1971-1973), з 1973 г. - старшыня калгаса імя Дзімітрава (цяпер ААТ «Стрыгава»). Працоўныя заслугі У. Р. Кузіча высока ацэнены дзяржавай: ордэны «Знак Пашаны» (1978) і «Працоўнага Чырвонага сцяга»

(1986), медаль «За доблесную працу», Ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі» (1999). З 1993 г. У. Р. Кузіч - старшыня абласнога Савета калгаснікаў, з 1 жніўня 2003 г. – старшыня Брэсцкага абласнога аграпрамысловага саюза, з 2008 г. - старшыня Кобрынскай раённай арганізацыі ветэранаў. У дзень 75-годдзя Кобрынскага раёна (2015) Уладзіміру Рыгоравічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

**Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 429. - (Вызначыліся працай. Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі БССР).

**Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – 2-е выд., дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – 49-52 с. : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Кузіч Уладзімір Рыгоравіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 130-131. : фат.

**Кузич, В. Г.** В буднях великих строек / [Владимир Кузич ; беседовала] Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 22 лютага (№ 14). — С. 4 : фот. - Заслуженный работник сельского хозяйства Беларуси, Почетный гражданин Кобринского района В. Г. Кузич отметил 80-летний юбилей.

**Курец, А. Н.** Делай, как Кузич! / Александр Курец ; фото автора // Сельская газета. - 2020. — 25 февраля (№ 22). — С. 8 : фот. - Заслуженный работник сельского хозяйства Беларуси В. Г. Кузич, 35 лет возглавлявший ОАО "Стригово" Кобринского района, отметил 80-летний юбилей.

### *75 гадоў з дня нараджэння М. П. Кузьміча (1950)*

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** - беларускі мастак, ювелір. Нарадзіўся 28 лістапада 1950 г. у в. Патрыкі. Закончыў Мінскае мастацкае вучылішча імя А. К. Глебава (1982). З 1983 г. удзельнік абласных, рэспубліканскіх, усесаюзных і замежных выстаў, міжнародных сімпозіумаў па эмалі ў Іспаніі, Латвіі і Літве. У 1993-1997 гг. узнаўляў страчаны ў час Вялікай Айчыннай вайны Крыж Ефрасінні Полацкай, аднавіў тэхніку перагародчатай эмалі XII ст. Сумесна з дактарамі Расійскай акадэміі навук А. Аляксеевым і Т. Макаравай выдаў кнігу «Крыж - прыгажосць царквы». Член Беларускага саюза мастакоў з 1987 года. Працаваў мастаком на Брэсцкім камбінаце «Мастацтва», з 1998 г. - мастак у Мінскай епархіі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі 1998 г. Узнагароджаны ордэнам Крыжа прападобнай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай (2002). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (2007).

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. - Т. 8. - С. 565.

**Кузьмич Николай Петрович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 514.

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. - Т. 4. – С. 618.

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Мастакі Брэстчыны / складальнік П. А. Рабаў. - С. 48—49. - Брэст, 2019

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 436. – (Імі ганарацца землякі).

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Сучаснае беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва XXI стагоддзе= Современное белорусское декоративно-прикладное искусство XXI век=Modern Belarustar ats and crats XXI century : альбом. - Мінск, 2013. - С. 104-105.

**Мікалай Кузьміч** // Мастакі Брэстчыны. - Брэст, 2010.- С. 70.

**Николай Кузьмич** // Художники Брестчины : альбом-каталог на русском и английском языках. – Брест, 1997. - С. 50.

**Художник** Н. П. Кузьмич, воссоздавший Крест Евфросинии Полоцкой // Современная Беларусь : энциклопедический справочник : в 3 т. - Минск, 2007. - Т. 3. Культура и искусство. – С. 342 : фот.

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 92-96. : фат.

**Мікалай Пятровіч Кузьміч**: чалавек стагоддзя : біябібліяграфічны паказальнік / Абласная бібліятэка імя М. Горкага; склад. Т. С. Філіпава, В. А. Гарбачэўская. – Брэст : Паліграфія, 2011.- 52 с.

**Лосич, П.** Мастеру — почет / Павел Лосич // Советская Белоруссия. - 2019. — 27 августа. — С. 7. - Художник-эмальер Н. Кузьмич стал почетным гражданином г. Бреста.

**Хокимова, А.** Николай Кузьмич — Почетный гражданин города Бреста / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. - 2019. — 23 августа. — С. 3.

### *100 гадоў з дня нараджэння Я. Р. Кузьміча (1925)*

**Кузьміч Якаў Раманавіч** нарадзіўся ў 1925 г. у в. Забужкі Кобрынскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі працаваў у калгасе «Савецкая Беларусь» Кобрынскага раёна, з 1957 г. у Яроміцкім будаўніча-мантажным упраўленні. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966), медалямі, Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

**Кузьміч Якаў Раманавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 427-428. - (Вызначыліся працай).

### *105 гадоў з дня нараджэння Л. К. Кустова (1920)*

**Кустоў Леў Канстанцінавіч** нарадзіўся ў 1920 г. У Вялікую Айчынную вайну ў 1941-1945 гг. удзельнічаў ва ўсіх аперацыях 60-га гвардзейскага Кобрынскага корпуснога артылерыйскага палка. Займаў пасады камандзіра батарэі, начальніка штаба артдывізіёна і першага памочніка начальніка штаба палка. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Кустоў Леў Канстанцінавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002.- С. 235. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *95 гадоў з дня нараджэння Л. М. Лаганчука (1930)*

**Лаганчук Леанід Міхайлавіч**. Кандыдат тэхнічных навук, дацэнт. Нарадзіўся 25 красавіка 1930 г. У 1948 г. Леанід Лаганчук скончыў сярэднюю школу № 1 г. Кобрына.

**Лаганчук Леанід Міхайлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 90 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

### *85 гадоў з дня нараджэння С. Ф. Любчука (1940)*

**Любчук Сяргей Фядосавіч** - беларускі дзеяч самадзейнага мастацтва, кампазітар, заслужаны работнік культуры Беларусі (1978). Нарадзіўся 2 мая 1940 г. у в. Дзівін Кобрынскага раёна. Скончыў Беларускую кансерваторыю (1965). З 1960 г. выкладчык, кіраўнік аркестра сярэдняй школы № 34, саліст-баяніст Беларускага тэлебачання і радыё ў Мінску. З 1965 г. у Брэсце: кіраўнік аркестра народных інструментаў і выкладчык музычнага вучылішча, кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Брастчанка» электрамеханічнага завода, з 1980 г. мастацкі кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Бярэсце» Палаца культуры аблсаўпрофа. Аўтар фантазіі на тэмы беларускіх народных песень для баяна з аркестрам народных інструментаў, рамансаў, песень, музыкі да спектакляў абласнога тэатра лялек, апрацовак і пералажэнняў для аркестра народных інструментаў і народных хароў.

**Любчук Сергей Федосович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [В 7 т.]. - Минск, 2006. - Т. 4.- С. 594.

**Любчук Сяргей Фядосавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 9. – С. 400.

**Любчук Сергей Федосьевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2-х кн. – Минск, 2009. – Кн. 2. – С. 52.

**Любчук Сяргей Фядосавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 122-123. : фат.

### *100 гадоў з дня нараджэння А. А. Ляскова (1925)*

**Ляскоў Афанасій Ануфрыевіч** нарадзіўся у 1925 г. у мястэчку Стара-Свянцяны, Літва. З 1927 г. жыў у Кобрыне. У 1944 г. добраахвотна пайшоў на фронт, быў накіраваны ў 9 паветрана-дэсантную дывізію. Удзельнік вызвалення Кобрына. У 1945 г. памочнік камандзіра ўзвода 175-га палка. У 1945 г. удастоены амерыканскага ордэна «Легіён за заслугі». Дэмабілізаваны ў 1958 г. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Славы II і III ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1985 г. жыў у Брэсце.

**Ляскоў Афанасій Ануфрыевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 236 : фат. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *80 гадоў з дня нараджэння М. М. Макарука (1945)*

**Макарук Міхаіл Маркавіч** - кандыдат ваенных навук, генерал-лейтэнант (2000). Нарадзіўся Міхаіл Макарук 1 жніўня 1945 г. у в. Мацы Кобрынскага раёна. З 1991 г. ён памочнік галоўнакамандуючага ВПС, намеснік начальніка ўпраўлення ВПС Галоўнага аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных сіл Расійскай Федэрацыі. Ваенны, ваенна-паветраны і ваенна-марскі аташэ пры пасольстве Расійскай Федэрацыі ў Іспаніі (1997-2000), з 2001 г. - у Рэспубліцы Куба. 1 жніўня 2005 г. Міхаіл Маркавіч сышоў у запас у сувязі з пенсійным узростам.

**Макарук Міхаіл Маркавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 437. – (Імі ганарацца землякі).

**Макарук Міхаіл Маркавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын, 2020. – С. 97-98 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Гурда, В.** Орел крылатого племени Брестчины / Владимир Гурда // Кобрин-информ. – 2006. – 12 января.

### *80 гадоў з дня нараджэння І. П. Мароза (1945)*

**Мароз Іван Паўлавіч** нарадзіўся 22 сакавіка 1945 г. у в. Свішчы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Сваю працоўную дзейнасць пачаў у 1966 г. майстрам Кобрынскага рамонтнага завода. З 1969 г. па 1986 г. працаваў на пасадзе начальніка вытворча-дыспетчарскага аддзела Кобрынскага рамонтнага завода. У 1986 г. Іван Мароз прызначаны кіраўніком Кобрынскай сельгастэхнікі. Пасля перайменавання ў адкрытае акцыянернае таварыства «Кобрынаграмаш» з 2003 г. па жнівень 2014 г. працаваў дырэктарам прадпрыемства. Без малога 30 гадоў ён кіраваў прадпрыемствам з колькасцю работнікаў каля 750 чалавек. У 1987 г. Іван Паўлавіч узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць», у 1989 г. - медалём «Ветэран працы», у 1999 г. - ордэнам Пашаны, у 2004 г. - ордэнам Айчыны III ступені, граматамі Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта і Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта. Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 13 студзеня 2015 г. № 37 за асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна Марозу Івану Паўлавічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

**Мароз Іван Паўлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. – 2-е выд., дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – 53-54 с. : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Мароз Іван Паўлавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 62-63 : фат.

**Кузина, С.** Навечно сохраним / Светлана Кузина // Кобрынскі веснік. - 2018. – 6 кастрычніка. - С. 4. - Почетный гражданин Кобринского района И. Мороз подарил архиву свои документы.

### *65 гадоў з дня нараджэння А. А. Мельнікава (1960)*

**Мельнікаў Аляксандр Аляксандравіч** (1960-1986). Прапаршчык. Нарадзіўся 16 лістапада 1960 г. у в. Дубрава Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. У 1976 г. закончыў 8 класаў СШ № 2 г. Кобрына, у 1979 г. – Белаазёрскае ПТВ № 82. Пасля тэрміновай службы працаваў мантажнікам у міжкалгасным сельскім будаўнічым камбінаце г. Кобрына. У 1985 г. зноў звязаў свой лёс з арміяй. Прапаршчык А. А. Мельнікаў загінуў у Афганістане ў 1986 г. Пахаваны на могілках г. Кобрына. У музеі баявой славы СШ № 2 г. Кобрына А. Мельнікаву прысвечана экспазіцыя.

**Мельнікаў Аляксандр Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 446. - (Загінулі ў Афганістане).

**Мельнікаў Аляксандр Аляксандравіч** // Памяць. Афганістан. – Мінск, 1991. – С. 292.

### *120 гадоў з дня нараджэння С. К. Місюка (1905)*

**Місюк Сяргей Карпавіч** нарадзіўся ў 1905 г. у в. Дзевяткі. Да вайны жыў у в. Брылёва і працаваў на торфапрадпрыемстве «Брылёва». З красавіка 1942 г. да мая 1944 г. - радыст у партызанскім атрадзе імя Суворава брыгады імя Молатава Пінскага партызанскага злучэння, прымаў удзел у баявых аперацыях. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны медалямі.

**Місюк Сяргей Карпавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002.- С. 237 : фат. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *75 гадоў з дня нараджэння П. А. Міхайлава (1950)*

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** - дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Нарадзіўся 13 кастрычніка 1950 г. у в. Ушкавіца Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Аўтар больш за 140 навуковых і навукова-метадычных прац па разнастайных актуальных пытаннях сучаснай беларускай лінгвістычнай і метадычнай навукі. Ён вучоны сакратар савета па абароне дысертацый пры БДПУ імя Максіма Танка, член вучоных саветаў універсітэта і факультэта беларускай філалогіі і культуры.

**Дзятко, Д. В.** Міхайлаў Павел Аляксандравіч / Д. В. Дзятко, С. У. Шахоўская // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] – Мінск, 2014. – Т. 5. - С. 597.

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 438. – (Імі ганарацца землякі).

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 105-108 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

### *40 гадоў з дня нараджэння І. Ю. Міхуты (1985)*

**Міхута Ігар Юр'евіч** - кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дактарант дактарантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Танка. Нарадзіўся ў 1985 г. у г. Кобрыне. Выпускнік сярэдняй школы № 1 г. Кобрына. Скончыў факультэт фізічнага выхавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Танка.

**Міхута Ігар Юр'евіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 108-109 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

### *105 гадоў з дня нараджэння А. Д. Нікіціна (1920)*

**Нікіцін Аляксей Дзмітрыевіч** (1920-2000). Нарадзіўся ў 1920 г. ва Ульянаўскай вобласці, дзе бацькі былі ў бежанстве ў час Першай сусветнай вайны. У пачатку 1920-х гадоў сям'я вярнулася на Кобрыншчыну. У 16 гадоў стаў членам КСМЗБ, праз год - сакратаром ячэйкі. У 1939 г. прызначаны старшынёй рэўкама і членам сялянскага камітэта ў роднай вёсцы Акцябр, пазней загадваў пачатковай школай у в. Перавессе. У гады Вялікай Айчыннай вайны - камандзір разведвальна-дыверсійнай групы, якая выконвала заданні разведупраўлення Чырвонай арміі. Група базіравалася ў Грушаўскім лесе, падтрымлівала сувязь з Турнянскім антыфашысцкім камітэтам, партызанскім атрадам імя Кірава і падпольшчыкамі Кобрына. У ліпені 1944 г. група і яе камандзір удзельнічалі ў вызваленні Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

**Нікіцін Аляксей Дзмітрыевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 223. - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *110 гадоў з дня нараджэння М. Л. Падзілы (1915)*

**Падзіла Міхаіл Лаўрэнавіч** (1915-1992). Нарадзіўся 20.09.1915 г. у г. Чаркасы (Украіна). У чэрвені 1941 г. быў дэмабілізаваны ў Чырвоную армію, ваяваў у складзе 9-га гвардзейскага Адэскага знішчальнага авіяпалка, удзельнічаў у абароне Адэсы,

Сталінграда, штурме Берліна. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны жыў у Кобрыне, працаваў начальнікам дарожнай арганізацыі.

**Падзіла Міхаіл Лаўрэнавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 244-245 : фат. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *65 гадоў з дня нараджэння І. П. Панасюка (1960)*

**Панасюк Іван Паўлавіч** - кандыдат філасофскіх навук, старшыня савета дырэктароў ААТ «Новасібірскколермет», старшыня праўлення беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў гонар святой Еўфрасінні Полацкай. Нарадзіўся Іван Панасюк 14 красавіка 1960 г. у в. Лелікава Кобрынскага раена. У 2004 г. І. П. Панасюк першым з грамадзян Расіі быў узнагароджаны беларускім медалём Францыска Скарыны. Узнагароду «За вялікі асабісты ўклад у культурна-асветніцкую дзейнасць, прапаганду духоўнай спадчыны беларускага народа ў Расійскай Федэрацыі» Івану Паўлавічу ўручыў асабіста Прэзідэнт Беларусі.

**Кунц, Н. З.** Панасюк Иван Павлович / Н. З. Кунц // Гордость кадетского братства: выпускники суворовских военных и нахимовских военно-морских училищ, добившихся государственной и общественной известности / Н. З. Кунц. - М., 2010. - С. 438, 439, 440.

**Панасюк Іван Паўлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 113-116 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Казакова, А.** Белорусский сибиряк / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. – 8 сентября. - С. 4, 5.

### *150 гадоў з дня нараджэння С. К. Паўловіча (1875)*

**Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч** (1875-1940). Кандыдат багаслоўскіх навук, беларускі грамадскі, культурна-асветны дзеяч, педагог, публіцыст. З'яўляецца адной з выдатных, але незаслужана забытых асобаў беларускага духоўнага асветніцтва. Нарадзіўся 13 верасня 1875 г. у в. Асавец Кобрынскага павета Гродзенскай губерні. Навуковец адыграў значную ролю ў пашырэнні пісьменнасці, асветы на роднай мове ў Заходняй Беларусі. Значнасць асобы С. К. Паўловіча ў тым, што па-першае, ён, міранін з тэалагічнай адукацыяй, шмат папрацаваў на ніве духоўнага асветніцтва беларусаў; па-другое, ён як асветнік, клапаціўся пра тое, каб самыя шырокія колы насельніцтва, асабліва моладзь, спасцігалі асновы хрысціянскай веры. Памёр 16 верасня 1940 г.

**Вабищевич, А. Н.** Павлович Сергей Константинович / А. Н. Вабищевич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2007. – Т. 5. - С. 679.

**Ліс, А. С**. Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч / А. С. Ліс // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1975. - Т. 8. - С. 332.

**Ліс, А. С.** Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч / А. С. Ліс // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1987. – Т. 4. – С. 119, 120.

**Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1981. – Т. 5 : Біяграфічны даведнік. – С. 473, 474.

**Павлович Сергей Константинович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. – Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 2. - С. 183.

**Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 117-120 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

### ***105 гадоў з дня нараджэння І. А. Петруковіча (1920)***

**Петруковіч Іван Арсеньевіч** (1920-1944). Нарадзіўся ў 1920 г. у в. Баршчы Кобрынскага раёна. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны стаў падпольшчыкам. Потым дзейнічаў у партызанскім атрадзе. На яго рахунку было 19 узарваных варожых эшалонаў і шмат гітлераўцаў. У ноч на 13 чэрвеня 1944 г. на чыгуначнай станцыі Тэўлі на лініі Брэст-Мінск ён рыхтаваўся да падрыву чарговага варожага эшалона, але быў заўважаны і акружаны. Гітлераўцы хацелі ўзяць Петруковіча ў палон жывым, але ён узарваў снарадам сябе і ворагаў. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

**Петруковіч Іван Арсеньевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 224. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### ***105 гадоў з дня нараджэння Р. М. Піракоўскага (1920)***

**Піракоўскі Рыгор Мікітавіч** нарадзіўся 25 студзеня 1920 г. у в. Наваселіца Жытомірскай вобласці (Украіна). Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны прызваны ў Чырвоную армію, служыў у часці, якая размяшчалася паблізу Брэста. З 1943 г. у партызанскім атрадзе імя Чапаева брыгады імя Чапаева, быў палітруком роты. Узнагароджаны медалямі. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў з ліпеня 1944 г. працаваў загадчыкам агульнага аддзела райвыканкама. У 1945-1948 гг. - настаўнік Імянінскай пачатковай школы, потым дырэктар школы ў в. Кустовічы.

**Піракоўскі Рыгор Мікітавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 245. – (Крутымі дарогамі вайны).

### ***100 гадоў з дня нараджэння П. Я. Плотка (1925)***

**Плотка Пётр Якаўлевіч** нарадзіўся 6 жніўня 1925 г. у в. Любашава Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут імя В. П. Чкалава (1954). У Вялікую Айчынную вайну ў 1944-1945 гг. на 1-м Беларускім фронце. З 1946 г. інструктар, першы сакратар Ганцавіцкага райкама ЛКСМБ. У 1950-1957 гг. загадчык Ганцавіцкага, Жабінкаўскага раёна. Працаваў намеснікам старшыні райвыканкама і сакратаром Антопальскага райкама КПБ. У 1959-1962 гг. старшыня калгаса «Новы шлях» (в. Гарадзец Кобрынскага раёна). З 1962 г. па 1965 г. - старшыня, намеснік старшыні Кобрынскага райвыканкама. З 1965 г. - старшыня раённага камітэта народнага кантролю, з 1976 г. дырэктар, з 1985 г. настаўнік гісторыі сярэдняй школы № 5. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені (1985), Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Плотка Пётр Якаўлевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002.- С. 454 : фат. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Плотка Пётр Якаўлевіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 70 : фат.

### ***170 гадоў з дня нараджэння Я. А. Рагоўскага (1855)***

**Рагоўскі Яўген Аляксандравіч** (1855-1923). Фізік і метэаролаг, прафесар Пецярбургскага і Харкаўскага ўніверсітэтаў. Нарадзіўся ў 1855 г. у г. Кобрыне Гродзенскай губерні. Навуковыя працы, якія друкаваліся ў «Журнале Рускага фізіка-хімічнага таварыства», «Nature», «Astron. Nahhrichten» і інш., прысвечаны такім пытанням, як будова зямной атмасферы, тэмпература і склад атмасферы Сонца і планет, сонечная радыяцыя, кінетычная тэорыя газаў. Вучоны праводзіў фотаметрычныя назіранні.

**Гапоненка, В. А.** Рагоўскі Яўген Аляксандравіч / В. А. Гапоненка // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2001. - Т. 13. - С. 202.

**Рагоўскі Яўген Аляксандравіч** // 250 асоб з Беларусі у дыялогах культур : даведачнае выданне / рэд.: Т. Л. Пісарэнка, Л. У. Языковіч. – Мінск, 2008. – С. 77, 78.

**Рагоўскі Яўген Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 123-125 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

### *100 гадоў з дня нараджэння М. С. Сакалюка (1925)*

**Сакалюк Мікалай Сцяпанавіч** нарадзіўся ў 1925 г. у в. Верхалессе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў загадчыкам хаты-чытальні, старшынёй Верхалескага сельсавета, старшынёй раённага камітэта ДТСААФ. З 1953 г. старшыня калгаса «Новае жыццё». Узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, Чырвонай Зоркі, Леніна (1966).

**Сакалюк Мікалай Сцяпанавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 428. – (Вызначыліся працай).

**Сакалюк Мікалай Сцяпанавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 23 : фат.

### *125 гадоў з дня нараджэння А. Ц. Салея (1900)*

**Салей Андрэй Цімафеевіч** нарадзіўся ў 1900 г. у в. Балота Кобрынскага раёна. Вялікая Айчынная вайна застала яго ў в. Павіцце. У 1943-1944 гг. быў сувязным партызанскага атрада імя Катоўскага, збіраў і перадаваў партызанам звесткі пра дыслакацыю акупантаў і зброю. Узнагароджаны медалямі.

**Салей Андрэй Цімафеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 225 : фота – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *125 гадоў з дня нараджэння Л. М. Сандалава (1900)*

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** (1900-1987). Нарадзіўся 10 красавіка 1900 г. у г. Вічуга Іванаўскай вобласці (Расія). Удзельнік баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Генерал-палкоўнік (1944). У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у абарончых баях у раёне Брэста, Жабінкі, Кобрына і інш. У 1941-1945 гг. - начальнік штаба Бранскага, 2-га Прыбалтыйскага, 4-га Украінскага франтоў. Да 1953 г. на камандных пасадах у Савецкай арміі. Аўтар кніг «Пагарэла-Гарадзішчанская аперацыя» (1960), «Цяжкія рубяжы» (1965), «Перажытае» (1966), «На маскоўскім напрамку» (1970), «Пасля пераломў» (1983). Памёр 23 кастрычніка 1987 г.

**Долготович, Б. Д.** Сандалов Леонид Михайлович / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Сандалов Леонид Михайлович** // Большая советская энциклопедия : [в 30 т.]. – М., 1975. – Т. 22. - С. 557.

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 14. - С. 147.

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 139-140 : фат.

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – 2-е выд., дап. – Кобрын, 2020. – 25-27 с. : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

## *55 гадоў з дня нараджэння Т. М. Саўчук (1970)*

**Саўчук Таццяна Мікалаеўна** - вучоны, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Мінскага інстытута кіравання. Нарадзілася Таццяна Саўчук у 1970 г. у г. Кобрыне**.** Галіны моваўнаўства, у якіх працуе і можа выступаць у якасці эксперта, апанента: камунікатыўная лінгвістыка, прагмалінгвістыка, лінгвістыка тэксту, культура мовы, стылістыка.

**Саўчук Таццяна Мікалаеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Саўчук Таццяна Мікалаеўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 127-128 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

## *125 гадоў з дня нараджэння М. А. Саўчука (1900)*

**Саўчук Міхаіл Андрэевіч** (1900-1982). Нарадзіўся 7 лістапада 1900 г. у в. Сухоўчыцы, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Пасля вайны на адміністрацыйнай і гаспадарчай рабоце. Памёр 25 жніўня 1982 г.

**Савчук Михаил Андреевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Брестская область : в 2-х кн. – Минск, 2009. – Кн. 2. – С. 329.

**Саўчук Міхаіл Андрэевіч** // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 : энцыклапедыя. – Мінск, 1990. – С. 555.

## *85 гадоў з дня нараджэння М. А. Свідуновіча (1940)*

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** - доктар тэхнічных навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, прэзідэнт Расійска-Беларускай навукова-тэхнічнай асацыяцыі «Сумесныя праекты», віцэ-прэзідэнт асацыяцыі «Чарнобыль і экалогія» (ЗША). Нарадзіўся 29 красавіка 1940 г. у в. Дзівін**.** М. А. Свідуновіч чытаў лекцыі ў вядучых універсітэтах свету ў ЗША, Францыі, Вялікабрытаніі. Ён падпісваў міжнародныя кантракты з Балгарыяй, Чэхіяй. За апошні час М. А. Свідуновіч выканаў шэраг праектаў, якія звязаны з высокатэмпературнай перапрацоўкай металазмяшчальных адходаў. Ён адкрыў новы напрамак па ўплыву фулеронаў на ўласцівасці спецыяльных сталей і сплаваў. Член Савета фонда фундаментальных даследванняў Рэспублікі Беларусь, старшыня секцыі «Атрыманне і выкарыстанне плазмы» Савета Акадэміі навук Беларусі.

**Миляшкеіч, Я. Г**. Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч / Я. Г. Міляшкевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 14. – С. 257.

**Свидунович Николай Александрович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 6. - – С. 589.

**Свидунович Николай Александрови**ч // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 334.

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 130-132 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

### *100 гадоў з дня нараджэння М. Т. Свірыдзюка (1925)*

**Свірыдзюк Мікалай Тарасавіч** нарадзіўся 27 красавіка 1925 г. у в. Турная Кобрынскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. член Турнянскага антыфашысцкага камітэта, потым сувязны партызанскага атрада імя Арлова брыгады імя Чапаева. Удзельнічаў у шэрагу баявых аперацый партызан супраць захопнікаў, вызваленні Кобрына. Мае ўзнагароды. Пасля вайны працаваў у органах унутраных спраў, загадчыкам аддзелаў камунальнай гаспадаркі, сацыяльнага забеспячэння Кобрынскага райвыканкама, старшынёй калгаса імя Жданава Кобрынскага раёна.

**Свірыдзюк Мікалай Тарасавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 225 : фат. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *105 гадоў з дня нараджэння М. П. Святлова (1920)*

**Святлоў Мікалай Пятровіч** (1920-1944). Нарадзіўся ў 1920 г. у в. Вдулі Воласаўскага раёна Ленінградскай вобласці. З 1940 г. у Чырвонай арміі, служыў стралком на 1-й пагранзаставе Брэсцкага пагранічнага атрада. Вялікую Айчынную вайну сустрэў на граніцы. У верасні 1942 г. стаў партызанам атрада імя Катоўскага, быў радавым, камандзірам аддзялення, памочнікам начальніка асобага аддзела атрада. 6 красавіка 1944 г. забіты гестапаўскім агентам. Пасмяротна ўзнагароджаны медалём «За адвагу».

**Святлоў Мікалай Пятровіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 225: фат. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *140 гадоў з дня нараджэння У. Д. Севасцьянава (1885)*

**Севасцьянаў Уладзімір Дзянісавіч** (1885–1956). Удзельнік грамадзянскай вайны, генерал-маёр юстыцыі (1943). Нарадзіўся ў 1885 г. у г. Кобрыне. Член КПСС з 1919 г. У Чырвонай Арміі са жніўня 1918 г. Удзельнік баёў на Паўднёвым фронце. З 1937 г. - намеснік ваеннага трыбунала Прыволжскай акругі, потым арміі. У Айчынную вайну - старшыня ваеннага трыбунала Асобнай Арміі і Ціхаакіянскага флоту. Пасля вайны старшыня ваеннага трыбунала Ціхаакіянскага і Ваенна-марскога гарнізона Ленінграда. З 1950 г. у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

**Севасцьянаў Уладзімір Дзянісавіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1973. – Т. 9. – С. 462.
**Севасцьянаў Уладзімір Дзянісавіч** // Новыя кнігі. - 2014. - № 9. – С. 12.

### *105 гадоў з дня нараджэння І. К. Семенюка (1920)*

**Семянюк Іван Карпавіч** (1920-1947**)**. Нарадзіўся 25 чэрвеня 1920 г. у в. Стрыі ў сялянскай сям'і. Прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху, ваяваў у атрадзе імя Чапаева. Яго партызанская мянушка была Ванька Чорны. Пасля вызвалення Кобрынскага раёна І. К. Семянюк працаваў намеснікам раённага ўпаўнаважанага. У лістападзе 1947 г. Семянюк загінуў ад бандыцкай кулі.

**Сушчук, А. М.** Вайна закончылася, а людзі гінулі / А. М. Сушчук // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка - Мінск, 2002. - С. 396 : фат.

### *105 гадоў з дня нараджэння С. Ф. Семенюка (1920)*

**Семянюк Стафан Фёдаравіч** (1895-1931). Нарадзіўся 3 снежня 1895 г. у в. Яромічы Кобрынскага раёна. Асобнай роты службы сувязі матрос 2-й ст. Стафан Семянюк на флоцкую службу прызываўся ва ўмовах царскай імперыі, а вярнуўся на Кобрыншчыну, калі ўжо ўсталявалася панаванне Польшчы. У далейшым - удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, вызваляў Польшчу ад гітлераўскіх акупантаў і быў паранены. Невядома, што абуджала ў Стафане Семенюку, што жывіла ў ім імкненне да паэтычнага

слова. Невыпадкова ён адразу пайшоў вучыцца, калі пры Яроміцкай сельскай школе адкрыліся курсы для дарослых. С. Семянюк адгукаўся ў сваіх вершах на розныя праявы сялянскай рэчаіснасці. 17 мая 1931 г. на 36-м годзе жыцця памёр. Рана згас паэтычны дар, які так і не змог разгарнуцца ў поўную сілу.

**З вершаў** С. Семенюка // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 119.

**Сушчук, А.** Ен валодаў паэтычным дарам / А. Сушчук // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 118-119.

**Семенюк, С.** Тяжка праца селян.. Ми ж хіба не народ? : стихи / Степан Семенюк // До тебе, світе...: українська література Берестейщини. – Київ, 2003. - С. 146-147.

**Степан Семенюк** (1895-1931) // До тебе, світе..: українська література Берестейщини. - Київ, 2003. - С. 144-145.

### *85 гадоў з дня нараджэння У. А. Семенюка (1940)*

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч** - беларускі філосаф, палітолаг, доктар філасофскіх навук (1990), прафесар (1993). Нарадзіўся 16 лістапада 1940 г. у в. Залессе Кобрынскага раёна. У. А. Семянюк – прафесар кафедры «Философские учения» факультэта тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Галоўныя навуковыя працы: «Хрысціянскі гуманізм» (1969), «Сіянізм у палітычнай стратэгіі імперыялізму» (1981) і інш.

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 440-441 : фат. – (Імі ганарацца землякі).

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 134-135 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

### *105 гадоў з дня нараджэння М. Ф. Сідарука (1920)*

**Сідарук Максім Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1920 г. у в. Корчыцы Кобрынскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Славы II і III ступеней, ордэнам Айчыннай вайны, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі. Пасля вайны працаваў кавалём у калгасе «Сцяг Перамогі» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1978).

**Сідарук Максім Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 428. - (Вызначыліся працай).

**Сідарук Максім Фёдаравіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 23-24: фат.

### *35 гадоў з дня нараджэння А. В. Сінчука (1990)*

**Сінчук Алег Віктаравіч -** навуковец-біёлаг, аспірант, асістэнт кафедры заалогіі біялагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ). Нарадзіўся 21 мая 1990 г. у в. Верхалессе Кобрынскага раёна. Вобласць навуковых інтарэсаў А. Сінчука: фауна, біялогія і экалогія расліннаедных і грамадскіх насякомых (Insecta: Hymenoptera: Formicidae) Беларусі, асновы біятэхналогіі. Агульная колькасць публікацый маладога навукоўца - больш 20.

**Елизарова, Ж.** Профессия – энтомолог / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2017. – 23 верасня. – С. 9.

**Сінчук Алег Віктаравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 137-138 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

### *125 гадоў з дня нараджэння Г. Г. Смольскага (1900)*

**Смольскі Гардзей Георгіевіч** нарадзіўся ў 1900 г. у в. Паляцічы Кобрынскага раёна. З 1923 г. член КПЗБ. Удзельнічаў у стварэнні камуністычных ячэек у Паляцічах і Кобрыне. З 1923 г. сакратар райкама, з 1925 г. член часовага сакратарыята Віленскага і Брэсцкага акругкамаў КПЗБ. У 1926 г. арыштаваны і прыгавораны да 4 гадоў зняволення. Пасля выхаду з турмы прымаў удзел у арганізацыі выступленняў рабочых гарбарных і дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, батракоў і інш. У Вялікую Айчынную вайну сувязны партызанскіх атрадаў імя Чапаева і імя Арлова брыгады імя Чапаева.

**Смольскі Гардзей Георгіевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 115-116 : фат. - (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне. 1921-1939).

### *225 гадоў з дня нараджэння А. Д. Сузіна (1800)*

**Сузін Адам Дамінікавіч** (1800-1879). Магістр філасофіі, этнограф, падарожнік, даследчык-натураліст. Нарадзіўся 10 студзеня 1800 г. у маёнтку Кулігоўшчына Кобрынскага павета Гродзенскай губерні. У беларускую свядомасць гэту неардынарную асобу вярнуў гісторык Валянцін Пятровіч Грыцкевіч. Пра Адама Сузіна можна гаварыць не толькі, як пра рэвалюцыянера, але і як падарожніка, даследчыка-натураліста, этнографа. Памер 11 снежня 1879 г.

**Грыцкевіч, А.** Сузін Адам / Анатоль Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 2001. - Т. 6, кн. 1. - С. 443.

**Грицкевич, А. П**. Сузин Адам / А. П. Грицкевич // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 391.

**Грицкевич, В. П.** В степи за Илеком / В. П. Грицкевич // От Немана к берегам Тихого океана / В. П. Грицкевич. – Минск, 1986. – С. 132-148.

**Марціновіч, А.** Адам Сузін / Алесь Марціновіч // Гісторыя праз лёсы. Т 8 / Алесь Марціновіч. – Мінск, 2020. – Кн. 1. - С. 8-29.

**Сузін Адам Дамінікавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 139-141 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

### *100 гадоў з дня нараджэння А. М. Сушчука (1925)*

**Сушчук Аляксей Міхайлавіч** нарадзіўся 8 мая 1925 г. у в. Кустовічы Кобрынскага раёна. З 1943 г. сувязны партызанскага атрада імя В. І. Чапаева. Са жніўня 1944 г. у Чырвонай арміі, з лістапада 1944 г. да мая 1945 г. прымаў удзел у ваенных дзеяннях. Пасля дэмабілізацыі працаваў дырэктарам кінафікацыі Кобрынскага раёна, загадчыкам аддзела культуры Кобрынскага райвыканкама, дырэктарам гарпалівазабеспячэння. Закончыў завочна Вышэйшую партыйную школу (1970). На працягу доўгіх гадоў супрацоўнічаў з рэдакцыяй газеты «Кобрынскі веснік», аўтар шматлікіх артыкулаў. З 1990 г. і да апошняга дня працаваў памочнікам-сакратаром дэпутата Вярхоўнага Савета, потым Нацыянальнага сходу Беларусі В. Ф. Кучынскага. Удзельнік юбілейнага парада Перамогі

на Краснай плошчы ў Маскве 9 мая 1995 г. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалямі «За доблесную працу», «Ветэран працы», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

**Сушчук Аляксей Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 245-246 : фат. – (Крутымі дарогамі вайны).

**Пустовой, Е**. Солдат эпохи / Е. Пустовой // Кобрин-информ. – 2005. – 25 августа. – С. 3. - К 80-летию А. М. Сущука.

## *80 гадоў з дня нараджэння А. С. Ткачука (1945)*

**Ткачук Антон Сцяпанавіч** (1945-2015). Нарадзіўся 7 студзеня 1945 г. у в. Жыдче Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1968 г. закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі па спецыяльнасці «інжынер-механік». З ліпеня 1968 г. па ліпень 1970 г. працаваў загадчыкам рамонтнымі майстэрнямі аддзялення «Сельгастэхніка» ў в. Дзівін Кобрынскага раёна. Шаснаццаць гадоў (з лютага 1981 г. па люты 1997 г.) узначальваў саўгас «Днепра-Бугскі». На працягу шасці гадоў з ліпеня 1997 г. па сакавік 2003 г. працаваў старшынёй Дзівінскага сельскага Савета дэпутатаў. За шматгадовую добрасумленную працу А. С. Ткачук узнагароджаны медалём «За доблесную працу», двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, шэрагам грамат. Памёр 9 чэрвеня 2015 г. У 2016 г. у пасёлку Арэхаўскі адбыўся мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі памяці першага кіраўніка саўгаса «Днепра-Бугскі».

**Ткачук Антон Сцяпанавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 77-78. : фат.

**Пашковіч, Л.** Добрая праца не забываецца / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. - 9 студзеня. - С. 1. - У пасёлку Арэхаўскі адбыўся мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі памяці першага кіраўніка саўгаса "Днепра-Бугскі" Антона Ткачука.

## *95 гадоў з дня нараджэння Ф. М. Торгуна (1930)*

**Торгун Фёдар Маркавіч** нарадзіўся ў 1930 г. у в. Варатынічы Кобрынскага раёна. Пасля службы ў радах Савецкай арміі пачаў працаваць у сістэме Кобрынскага райспажыўсаюза. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971), іншымі ўзнагародамі.

**Торгун Фёдар Маркавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 428. – (Вызначліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Фёдор Маркович Торгун** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Торгун Фёдар Маркавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 25 : фат.

## *105 гадоў з дня нараджэння І. С. Хаменка (1920)*

**Хаменка Іван Сяргеевіч** нарадзіўся ў 1920 г. у с. Скапцы (Васялінаўка) Барышаўскага раёна Кіеўскай вобласці. Закончыў Севастопальскае ваеннае зенітнае вучылішча. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у стварэнні партызанскай групы, якая разам з іншымі аб’ядналася ў атрад імя Шчорса. У красавіку 1943 г. - начальнік штаба атрада імя Катоўскага. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў працаваў у г.п. Антопаль.

**Хаменка Іван Сяргеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 218. - (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *100 гадоў з дня нараджэння Б. М. Шварко (1925)*

**Шварко Барыс Максімавіч** (1925-1988). Нарадзіўся 2 жніўня 1925 г. у в. Балоты Кобрынскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну ваяваў у складзе 429-га мінамётнага палка камандзірам мінамётнага разліку. Удзельнічаў у вызваленні Будапешта і Прагі. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

**Шварко** Барыс Максімавіч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 246 : фат. – (Яны прайшлі дарогамі вайны).

### *105 гадоў з дня нараджэння С. І. Шварко (1920)*

**Шварко Сямён Іванавіч** нарадзіўся ў 1920 г. у в. Балоты Кобрынскага раёна. У 1942-1943 гг. быў сувязным камсамольскага падполля з партызанамі. У маі 1943 г. пайшоў у партызанскі атрад імя Катоўскага, актыўна ўдзельнічаў у дыверсійнай барацьбе. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў накіраваны на службу ў органы НКУС і праслужыў там да выхаду на пенсію. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

**Шварко Сямён Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 227 : фат. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *85 гадоў з дня нараджэння М. Д. Юшчука (1940)*

**Юшчук Мікалай Дзмітрыевіч** - доктар медыцынскіх навук, прафесар, акадэмік Расійскай акадэміі медыцынскіх навук (РАМН), лаўрэат прэміі Урада Расійскай Федэрацыі, заслужаны дзеяч навукі Расіі. Нарадзіўся 22 снежня 1940 г. у в. Авады Кобрынскага раёна. Аўтар больш за 600 навуковых прац, вядомы вучоны з сусветным імем. Ён унёс вялікі ўклад у вывучэнне патафізіялогіі і распрацоўцы метадаў тэрапіі розных інфекцыйных хвароб. Пад кіраўніцтвам Мікалая Дзмітрыевіча праводзіцца вывучэнне малекулярна-біялагічных тэхналогій у дыягностыцы вірусных гепатытаў.

**Юшчук Мікалай Дзмітрыевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – С. 171-173 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Юшчук Мікалай Дзмітрыевіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 143-144 : фат.

**Савчук, М.** Дело всей жизни ученого Ющука / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2010. – 28 января. – С. 6.

# Юбілейныя даты рэлігійных установ горада і раёна

### *Свята-Спаскаму манастыру ў г. Кобрыне (1465) – 560 гадоў*

Найбольш старажытным помнікам праваслаўнага царкоўнага будаўніцтва з'яўляецца **Свята-Спаскі манастыр** у Кобрыне. Размешчаны на вуліцы 17 Верасня, 11 (былая Базыльянская), на левым беразе р. Мухавец. Упершыню ўпамінаецца ў 1465 г. як мужчынскі манастыр. Вядома, што манастыр быў створаны па ініцыятыве апошняга кобрынскага князя Івана Сямёнавіча. Доўгі час у будынку манастыра працаваў Кобрынскі раённы аддзел унутраных спраў. У сённяшні час па благаславенні Сінода Беларускай Праваслаўнай Царквы манастыр адраджаецца, але ўжо як жаночы манастыр Усяміласцівага Спасу. Галоўная мясцовая святыня - цудатворная ікона Божай Маці «Скарапаслушніца», створаная спецыяльна для манастыра на святой гары Афон. Спаскі манастыр уваходзіць у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Вярнуўшыся пад юрысдыкцыю царквы, гэты старадаўні куток Кобрына не страціў свой багаты турыстычны патэнцыял, прывабнасць для вандроўцаў самых розных канфесій, бо з ім злучана шмат гістарычных падзей.


**Барысюк, Ю. А.** Свята-Спаскі манастыр / Ю. А. Барысюк // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 460-461. - (Праваслаўнае мураванае дойлідства).

**Кобрынскі** Спаскі Манастыр // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1997. – Т. 4. - С. 222.

**Кулагін, А.** Свята-Спаскі манастыр / А. Кулагін // Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыклапедычны даведнік / А. Кулагін. – Мінск, 2007. – С. 202-203.

**Мешечко, Е. Н.** Во имя Всемилостивого Спаса женский монастырь / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Нёмана, Западного Буга и Припяти : путеводитель. – Брест, 2012.- С. 140.

**Обитель** Спаса Всемилостивого. К 550-летию Спасского монастыря в г. Кобрине (1465-2015) / сост. игумения Евфросиния (Куракевич). – Минск, 2015. – 64 с.

**Спаскі Манастыр** // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. – С. 226.

**Ярашэвіч, А.** Кобрынскі Спаскі манастыр / А. Ярашэвіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 371.

**Манастыр** у імя Усяміласцівага Спаса : краязнаўчы буклет / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук ; дызайн П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2020.


### *Свята-Петра-Паўлаўскай царкве ў Кобрыне (1465) – 560 гадоў*

**Свята-Петра-Паўлаўская царква** - адзін з самых старажытных храмаў Кобрына, помнік традыцыйнага народнага драўлянага дойлідства. Упамінаецца ў 1465 г., знаходзілася на паўднёвай ускраіне Рыначнай плошчы. Адзначана ў «люстрацыі» 1563 г. каралеўскага рэвізора Д. Сапегі і на плане горада 1798 г. Царкву часта наведваў Суворaў, які ахвяраваў на яе аздабленне некалькі абразоў (з гэтай нагоды называлася Петра-Паўлаўска-Суворaўскай). Пасля закрыцця ў 1960-я гг. XX ст. трох праваслаўных храмаў горада Петрапаўлаўская царква заставалася адзінай, уцалелай у ходзе барацьбы з рэлігіяй. Толькі ў ёй, адзінай ва ўсім горадзе, у савецкі час не спыняліся набажэнствы. Царква з'яўляецца помнікам традыцыйнага драўлянага дойлідства. Уваходзіць у Дзяржўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Кобрынская** Петрапаўлаўская царква // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 515.

**Кобринская** Петропавловская церковь // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 465.

**Кулагін, А.** Царква ў імя святых апосталаў Пятра і Паўла / А. Кулагін // Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыклапедычны даведнік / А. Кулагін. – Мінск, 2007. – С. 204.

**Петрапаўлаўская** царква // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. – С. 224.

**Петропавловская** церковь // Свод памятников истории и культуры Белорусии. Брестская область. – Минск, 1990. – С. 250.

**Свята-Петра-Паўлаўская** царква ў Кобрыне // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 462-463. - (Драўлянае царкоўнае дойлідства).

**Свята-Петра-Паўлаўская** царква ў Кобрыне // Архітэктура Беларусі : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 1993. – С. 245-246.

**Царква** ў імя святых апосталаў Пятра і Паўла : краязнаўчы буклет / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук ; дызайн П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2020.

## *Свята-Мікалаеўскай царкве ў г. Кобрыне (1750) – 275 гадоў*

**Мікольская царква** размешчана на вуліцы Мікольскай (былая Астрамецкая, Камуністычная), на правым беразе р. Мухавец. Пабудавана ў XVIII ст. (1750 г.). Царква - помнік архітэктуры класіцызму. Уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі.

**Габрусь, Т. В.** Кобрынская Мікалаеўская царква / Т. В. Габрусь, Т. І. Чарняўская // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1986. – Т. 3. – С. 87, 88.

**Кобрынская** Мікалаеўская царква // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 515.

**Свята-Мікалаеўская** царква // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 463. – (Драўлянае царкоўнае дойлідства).

## *Свята-Параскева-Пятніцкай царкве ў в. Дзівін (1740) – 285 гадоў*

**Свята-Параскева-Пятніцкая царква** размешчана на галоўнай вуліцы в. Дзівін алтаром на захад. Гэта сведчыць, што першапачаткова яна была касцёлам. Пабудавана ў 1740 г. намаганнямі святара Яна Антонія Ваяводскага. Царква - помнік архітэктуры, які спалучае будаўнічыя прыёмы мясцовага драўлянага дойлідства з элементамі барока. Уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Габрусь, Т. В.** Дзівінская царква Параскевы Пятніцы / Т. В. Габрусь // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1985. – Т. 2. – С. 292.

**Дзівінская** царква Параскевы Пятніцы // Архітэктура Беларусі. – Мінск, 1982. – С. 88.

**Дзівінская** царква Параскевы Пятніцы // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 3. – С. 394.

## *Іаана-Багаслоўскай царкве ў в. Кісялеўцы (1995) – 30 гадоў*

**Іаана-Багаслоўская царква** ў в. Кісялёўцы пабудавана ў 1910-я гады на месцы папярэдняга храма паводле праекта, распрацаванага архітэктарам У. А. Срокам. Знесена ў 1965 г. На яе месцы ў 1995 г. узведзена новая царква. Традыцыі народнага драўлянага царкоўнага дойлідства сцвярджаюцца і ў афіцыйным «сінодскім» будаўнічым праектаванні.

**Царква** ў в. Кісялёўцы // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 469. – (Драўлянае царкоўнае дойлідства).

## *Царкве на ўшанаванне іконы Божай Маці «Збавіцельніца» ў в. Пескі-2 (2015) - 10 гадоў*

**Царква на ўшанаванне іконы Божай Маці «Збавіцельніца».** Будаўніцтва царквы на ўшанаванне іконы Божай Маці «Збавіцельніца» ў Песках-2 доўжылася дзесяць гадоў. 30 кастрычніка 2015 г. адбылося асвячэнне царквы ў вёсцы Пескі-2.

**Дубіна, Л.** Доўгая дарога да храма / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015.- 4 лістапада. - С. 1, 2. - Будаўніцтва царквы ў Пескі-2 доўжылася 10 гадоў.

## *Царкве ў імя святога Іаана Багаслова ў в. Чаравачыцы (1995) – 30 гадоў*

**Царква ў імя святога Іаана Багаслова** пабудавана ў канцы XX ст. з цэглы. Асвячэнне царквы адбылося 10 лістапада 1995 г. ў гонар Казанскай іконы Божай Маці. Прастольнае свята - 21 ліпеня.

**Марчук, Н.** Утерянное православное наследие церкви, которые видели историю / Нина Марчук // Кобрин-информ. – 2014. – 13 ноября. – С. 11. - История церкви Параскевы Пятницы и Рождества Иоанна Богослова в д. Черевачицы.

# Юбілейныя даты прадпрыемстваў і ўстаноў горада і раёна

### ***Суду Кобрынскага раёна (1940) - 85 гадоў***

**Кобрынскі судовы ўчастак народных судоў Брэсцкай вобласці** быў утвораны 8 студзеня 1940 г. Народным суддзёй быў зацверджаны Іосіф Энцін - першы і на той час адзіны суддзя Кобрынскага судовага ўчастка. На працягу паўстагоддзя, з 1940 па 1990 г., невялікі калектыў у складзе 2 суддзяў, 2 сакратароў судовага пасяджэння, 2 судовых выканаўцаў і 4 чалавек тэхперсаналу працаваў у судзе Кобрынскага раёна. Новым этапам станаўлення судовай сістэмы Рэспублікі Беларусь з'яўляецца пачатак 1990-х гг., калі рэспубліка атрымала незалежнасць і перад судовай сістэмай былі пастаўлены новыя мэты і задачы. У наш час судом Кобрынскага раёна разглядаецца больш 350 крымінальных, 1900 грамадзянскіх і 2500 адміністрацыйных спраў, а таксама каля 300 матэрыялаў па скаргах. Актыўна вядзецца і прававвая праца па папярэджанні і прафілактыцы правапарушэнняў і злачынстваў.

**Белов, Д.** И правосудие - для всех / Дмитрий Белов ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2015. - 24 студзеня. —-С. 4. - В нынешнем году суд Кобринского района отмечает свой 75-летний юбилей.

### ***Дзяржаўнай натарыяльнай канторы Кобрынскага раёна (1940) - 85 гадоў***

**Кобрынская раённая дзяржаўная натарыяльная кантора** ўпраўлення Народнага Камісарыята юстыцыі БССР пры Брэсцкім абласным Савеце дэпутатаў працоўных утворана ў 1940 г. У верасні 1944 г. жыхароў г. Кобрына і Кобрынскага раёна абслугоўваў толькі адзін натарыус. 14 верасня 1987 г. утворана яшчэ адна натарыяльная кантора - дзяржаўная натарыяльная кантора горада Кобрына, якая абслугоўвала і прымала грамадзян і прадстаўнікоў арганізацый горада. Абедзве дзяржаўныя натарыяльныя канторы (Кобрынскага раёна і горада Кобрына) размяшчаліся ў адным будынку па вул. Пралетарскай, 121. 15 сакавіка 2002 г. загадам упраўлення юстыцыі Брэсцкага аблвыканкама дзве натарыяльныя канторы былі рэарганізаваны ў адну - дзяржаўную натарыяльную кантору Кобрынскага раёна.

**Савчук, М**. История становления и развития : Нотариальной конторе Кобринского район – 80 лет / Маргарита Савчук // Кобрин-информ – 2020. – 3 декабря (№ 49 ) – С. 2.

**Марчук, И.** К серьёзной работе - с душевным теплом / Ирина Марчук ; беседовал Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2013. — 30 сакавіка. — С. 3. - Чем сегодня живёт государственная нотариальная контора Кобринского района, рассказывает её заведующая Ирина Марчук.

### ***Кобрынскаму аддзелу Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь (1960) – 65 гадоў***

Загадам ад 1 чэрвеня 1960 г. № 151 УУС г. Брэста ўтвораны Кобрынскі аддзел пазаведамаснай аховы пры аддзеле ўнутраных спраў Кобрынскага гаррайвыканкама. Загадам аб'яднання «Ахова» пры МУС Рэспублікі Беларусь ад 30 верасня 1991 г. № 01 ён перайменаваны ў Кобрынскі аддзел аб'яднання «Ахова» пры МУС Рэспублікі Беларусь, загадам МУС Рэспублікі Беларусь ад 28 лютага 2004 г. перайменаваны ў **Кобрынскі аддзел Дэпартамента аховы МУС Рэспублікі Беларусь**.

**Савчук, М.** 60 лет на страже. Кобринский отдел охраны отметил юбилей / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. — 4 июня (№ 23). — С. 4 : фот. - Кобринский отдел Департамента охраны МВД Республики Беларусь отметил 60-летний юбилей.

**Ализар, К.** Бережет покой охрана / Ксения Ализар // Кобрынскі веснік. - 2019. — 26 кастрычніка. — С. 3 : фот. - В штате Кобринского отдела Департамента охраны МВД Республики Беларусь работают около 200 человек.

### *Адкрытаму акцыянернаму таварыству «САЛЕА-Кобрын» (1940) - 85 гадоў*

**ААТ «САЛЕА-Кобрын»** пачало сваю гісторыю з машынна-трактарнай майстэрні па рамонту машын і сельскагаспадарчай тэхнікі, якая была створана 11 лютага 1940 г. З 1959 г. завод пачаў спецыялізавацца на капітальным рамонце аўтамабіляў ГАЗ-51 і іх састаўных частак. З 1992 г. асноўным напрамкам гаспадарчай дзейнасці стала вытворчасць гідрацыліндраў для аўтамабіляў. У 1997 г. Кобрынскі рамонтны завод быў пераўтвораны ў адкрытае акцыянернае таварыства «Завод гідраўлічнага машына-будавання» (ААТ «Гідрамаш»). У канцы 2014 г. ААТ «Гідрамаш» змяніў фірменнае найменне на ААТ «САЛЕА-Кобрын» у сувязі з уступленнем у холдынг «САЛЕА». На заводзе асвоены выпуск больш за 900 тыпаразмераў гідрацыліндраў да аўтамабіляў МАЗ, трактароў МТЗ, франтальных пагрузчыкаў, featuring рознай дарожна-будаўнічай тэхнікі і сельгасмашын.

**Адкрытае** акцыянернае таварыства «Завод гідраўлічнага машынабудавання» // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 407-409. – (З гісторыі прадпрыемстваў Кобрына).

**«САЛЕА-Кобрын»**: стаўка на экспарт і мадэрнізацыю : бібліяграфічны паказальнік да 80-годдзя з часу заснавання ААТ «САЛЕА-Кобрын» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. Святлана Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – 40 с. - (З гісторыі прадпрыемстваў горада).

**Ковалевич, С. М.** Перспективы роста ОАО «САЛЕО-Кобрин» / [Сергей Ковалевич ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2020. — 1 октября (№ 40). — С. 2 : фот. - Беседа с директором ОАО «САЛЕО-Кобрин» С. М. Ковалевичем о планах, поставках и перспективных разработках.

**ОАО «САЛЕО-Кобрин»** — 80 лет! // Кобрин-информ. - 2020. — 13 февраля (№ 7). — С. 2—3 : фот.

**Елізарава, Ж.** ААТ «САЛЕА-Кобрын»: прынцыпы, якія дапамагаюць заваяваць свет / Жанна Елізарава // Кобрынскі веснік. - 2017. - 23 верасня. - С. 1, 2. - Сення ААТ «САЛЕА-Кобрын» займае трывалыя пазіцыі на рынку збыту.

**Жук, Е.** 79 млн долларов - на кобринский проект / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2017. — 23 августа. — С. 2. - ОАО «Салео-Кобрин» получит международный кредит на реализацию масштабного проекта по модернизации производства.

### *Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА» (1960) - 65 гадоў*

**Кобрынскі нструментальны завод** створаны ў 1960 г. на базе слясарнай майстэрні, лесапільні, кузні, ліцейна-механічнага завода, які ўваходзіў у склад райпрамкамбіната. У 1961-1965 гг. рэканструяваны, пабудаваны новыя цэхі. Прадпрыемства спецыялізавалася на выпуску шырокага асартыменту слясарна-мантажнага інструменту і тэхналагічнага абсталявання. Асноўная прадукцыя: ключы гаечныя розных памераў і найменняў, клупы трубныя для наразання разьбы са зменнымі плашкамі, нажніцы ручныя для рэзання металу, малаткі, зубілы, пласкагубцы, рамкі нажовачныя, клеймы ручныя лічбавыя і літарныя і інш. З 1968 г. - Кобрынскае інструментальнае вытворчае аб’яднанне. З 1986 г. завод у складзе беларускага інструментальнага вытворчага аб’яднання. З 1996 г. – рэспубліканскае вытворчае прадпрыемства «Кобрынскі інстументальны завод «СІТОМА». Прадпрыемства больш паўстагоддзя

паспяхова выступае на слясарна-мантажным рынку. Прадукцыя вядома ў краінах СНД і далёкага замежжа. Узнагароджаны Міжнароднай брыльянтавай зоркай за якасць.

**Рэспубліканскае** вытворчае прадпрыемства «Кобрынскі інстументальны завод «СІТОМО» // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 410. - (З гісторыі прадпрыемстваў Кобрына).

**«СІТОМА»**: час змяняецца – якасць застаецца : бібліяграфічны паказальнік да 60-годдзя з часу заснавання ААТ «Кобрынскі інструментальны завод «СІТОМА» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. Святлана Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. – 36 с. - (З гісторыі прадпрыемстваў горада).

**Белов, Д.** «Ситомо» : 60 лет на рынке инструмента / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2020. — 19 верасня (№ 73). — С. 4 : фот. - Кобринский инструментальный завод «Ситомо» — единственный производитель слесарно-монтажного инструмента на территории РБ.

### *Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Кобрынскі СБК» (1965) - 60 гадоў*

**ААТ «Кобрынскі СБК»** створана ў 1965 г. як Кобрынскі завод ЖБВ. Асноўнымі відамі дзейнасці з'яўляюцца вытворчасць і мантаж зборных жалезабетонных канструкцый, выкананне будаўніча-мантажных работ. Прадпрыемства спецыялізуецца на будаўніцтве аб'ектаў сельскагаспадарчага прызначэння. ААТ «Кобрынскі СБК» уваходзіць у склад адной з найбуйнейшых будаўнічых кампаній вобласці - аб'яднання «Брэстаблсельбуд». Прадпрыемства з'яўляецца манапалістам у Брэсцкай вобласці па будаўніцтву будынкаў і збудаванняў з рамных жалезабетонных канструкцый.

**Открытое** акционерное общество «Кобринский ССК» // Мы строим Брестчину. – Брест, 2019. – С. 300 : фат.

**Белов, Д.** Если строить, то на века! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. — 10 жніўня. — С. 1 : фот. - В канун профессионального праздника — о работе ОАО «Кобринский ССК».

**Казакова, А.** ОАО«Кобринский ССК»: анализируя прошлое, строим будущее / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. — 13 августа. — С. 3.

### *Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Ручайка» (1980) – 45 гадоў*

**ААТ «Ручайка»** - сучаснае прадпрыемства з багатай гісторыяй, згуртаваным калектывам і вопытам у сферы вытворчасці і продажу тэнтавых матэрыялаў, геатэкстыля, пражы, дэкаратыўных і тэхнічных тканін, дахавай мембраны. У 1980 г. прадпрыемства пачынала сваю дзейнасць як прадзільна-ткацкая фабрыка. Першая партыя тэкстылю выпушчана ў 1981 г. У 2007 г. з мэтай мадэрнізацыі вытворчасці было закуплена перадавое ткацкае і прадзільнае абсталяванне фірмы «SmitTextile» (Італія). Пачынаючы з 2009 г. лёс прадзільна-ткацкай фабрыкі «Ручайка» пачаў кардынальна мяняцца. Кіраўніцтва фабрыкі зрабіла стаўку на выпуск новай высакаякаснай прадукцыі, якая не мае аналагаў у Беларусі і заўсёды запатрабавана ў спажыўцоў. Пачынаючы з 2018 г. у рамках інвестыцыйнага праекта наладжана вытворчасць гатовых вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў з ПВХ кампазіцыямі, што дазволіла істотна пашырыць асартыментную лінейку гатовых тэнтавых і каркасна-тэнтавых вырабаў. ААТ «Ручайка» неаднаразова станавілася пераможцам Рэспубліканскага прафесійнага конкурсу «Лепшы будаўнічы прадукт года». У 2015 г. па выніках заключэння экспертнага савета тэнтавы і дахавы матэрыял вытворчасці ААТ «Ручайка» сталі лаўрэатамі конкурсу ў намінацыі «Лепшы будаўнічы матэрыял (выраб) года».

**Елизарова, Ж.** «Ручайка» - значит качество / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 24 снежня (№ 99). – С. 1, 4. – 30 декабря ОАО «Ручайка» отмечает 40-летний юбилей.

**Елизарова, Ж.** Будущее страны определяют инновации / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 13 чэрвеня (№ 45). — С. 1 : фот. – ОАО «Ручайка» — один из крупнейших в СНГ производителей баннерных и тентовых материалов, кровельной мембраны, материалов для шахтной вентиляции и гидроизоляции.

## *Замежнаму таварыству з абмежаванай адказнасцю «ВЕЛПАК-Кобрын» (2010) – 15 гадоў*

У кастрычніку 2010 г. на Кобрыншчыне пачало працу **ЗТАА «ВЕЛПАК-Кобрын»**. Прадпрыемства, якое займаецца вырабам гофракардону і вырабаў з яго, наладзіла моцныя партнёрскія адносіны з рознымі прадпрыемствамі па ўсёй рэспубліцы. У 2015 г. «ВЕЛПАК» - лепшы прадпрымальнік-арганізацыя, якая прыцягнула замежныя інвестыцыі. У 2019 г. ЗТАА «ВЕЛПАК-Кобрын» - сярод пераможцаў нацыянальнага конкурсу «Прадпрымальнік года» па выніках дзейнасці.

**Ализар, К.** Качество и индивидуальный подход / Ксения Ализар // Кобрынскі веснік. - 2019. — 2 лістапада. — С. 4. - На предприятии ИООО «Велпак-Кобрин» работают более 250 человек.

**Жук, Е.** «Велпак-Кобрин» / Елена Жук // Вечерний Брест. - 2017. — 29 сентября. — С. 4. - ИООО «Велпак-Кобрин» в числе победителей национального конкурса «Предприниматель года».

## *Замежнаму таварыству з абмежаванай адказнасцю «Лангхайнрых Канфекцыян Бел» (2005) - 20 гадоў*

Замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю **«Лангхайнрых Канфекцыян Бел»,** размешчанае ў Дзівіне, - паспяховы прыклад замежных інвестыцый у эканоміку нашай краіны. Створана ў рэканструіраваным будынку былога швейнага участка ў 2005 г. Гэта філіял фабрыкі па вытворчасці сталовай і пасцельнай бялізны нямецкага горада Шлітц. Схема простая: з Германіі паступаюць тканіны, у Германію - гатовыя швейныя вырабы, якія потым разыходзяцца практычна па ўсім свеце. Пасцельная бялізна, сурвэткі, абрусы і шматлікія іншыя тавары, выраблены прадпрыемствам, нязменна карыстаюцца попытам, асабліва ў сферы гасцінічнага бізнэсу. Фірма пастаўляе на рынак прадукцыю высокай якасці. Нягледзячы на даволі малады ўзрост, за паспяховую працу прадпрыемства ўжо было адзначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, неаднаразова станавілася пераможцам конкурсаў «Лепшы прадпрымальнік Брэсцкай вобласці» і «Лепшы прадпрымальнік Кобрынскага раёна».

**Бакун, А.** Інвестыцыі — у чалавека / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 15 студзеня (№ 3). — С. 5 : фот. - Лінейка прадукцыі ЗТАА «Лангхайнрых Канфекцыён Бел» складае больш за 250 відаў вырабаў.

**Дубина, Л**. Валентина Пашкевич: «Наша продукция - для особого потребителя» / Людмила Дубина // Кобрынскі веснік. - 2016. - 13 красавіка. - С. 2.

**Замежнае** таварыства з абмежаванай адказнасцю «Лангхайнрых Канфекцыян Бел» // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 59-60 : фат.

## ***Кобрынскаму раённаму спажывецкаму таварыству (1940) – 85 гадоў***

У 1940 годзе на падставе Устава раённага Саюза спажывецкіх таварыстваў, зацверджанага Пастановай Прэзідыума Цэнтрасаюза, быў створаны **Кобрынскі раённы саюз спажывецкіх таварыстваў**, у задачы якога ўваходзіла арганізацыя кааператыўнага гандлю. У гэтых мэтах Кобрынскі райспажыўсаюз арганізаваў на тэрыторыі свайго раёна Тэвельскае, Жухавецкае, Лепясоўскае, Залескае, Пескаўскае спажывецкія грамадства. У перыяд Вялікай Айчыннай вайны райспажыўсаюз спыніў сваю дзейнасць і аднавіў яе ў 1944 г. пасля вызвалення тэрыторыі раёна ад фашысцкіх захопнікаў. Першым старшынёй праўлення пасля вайны быў Мікулінскі Дзмітрый Андрэевіч (1949-1953). Першы магазін быў пабудаваны ў в. Стрыі ў 1948 г., у 1950 г. - у в. Яромічы, у 1955 г. - у в. Астромічы. У 1980 г. райспажыўсаюз аб'ядноўваў 5 спажывецкіх таварыстваў: нарыхтоўчую кантору, аб'яднанне грамадскага харчавання, універмаг, камбінат кааператыўнай прамысловасці. У райспажыўсаюзе працавалі 910 чалавек. У цяперашні час у склад Кобрынскага раённага спажывецкага таварыства ўваходзіць 1 філіял «Дзівінскі». Гандлёвая сетка налічвае 73 магазіна, у тым ліку 6 - гарадскіх, 67 - сельскіх, 5 аўтамагазінаў. Працуюць два рынкі, склад, 9 аб'ектаў грамадскага харчавання.

**Оскирко, И**. В автомагазине – самообслуживание, или Новинка в райпо / Иван Оскирко // Кобрынскі веснік. – 2020. – 25 лістапада. – С. 4. - Райпо приобрело новый современный атомагазин.

**Елизарова, Ж.** Всю жизнь работаю в райпо! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 4 красавіка. — С. 1.- Специалист и мастер своего дела в потребкооперации — И. Микитюк.

**Казакова, А.** «Родны кут» теперь в Залесье / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2013.— 12 сентября. — С. 3. - В Залесье открыся новый магазин Кобринского райпо.

# Юбілейныя даты медыцынскіх установ

## ***Установе аховы здароўя «Дзівінская ўчастковая бальніца» (1940) – 85 гадоў***

Будаўніцтва новай участковай бальніцы ў Дзівіне пачалося ў канцы 1980-х гг. XX ст. А неабходнасць такая наспела яшчэ раней: лячэбная ўстанова, вядучая сваю гісторыю з 1940 г., тулілася ў даўно аджыўшых сваё памяшканнях. Нягледзячы на цяжкасці перабудовачнага перыяду, Дзівінская ўчастковая бальніца была здадзена «пад ключ» у 1999 г. і абсталявана ўсім неабходным для лячэння пацыентаў. У зону абслугоўвання бальніцы уваходзіць з дзясятак вёсак з насельніцтвам каля 10 тысяч чалавек. Медыкам з Дзівіна дапамагаюць спецыялісты трох фельдшарска-акушэрскіх пунктаў і дзвюх урачэбных амбулаторый.

**Пашкович, Л.** В Дивине - новый рентген-кабинет / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2017. - 23 жніўня. - С. 4. - В Дивинской участковой больнице запущен обновленный рентген-кабинет с новейшим флюорографическим аппаратом.

**Пашкович, Л**. Здесь помогут / Людмила Пашкович ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2015. — 11 лютага. — С. 3. - О Дивинской участковой больнице.

**Белов, Д.** С милосердием в душе / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. – 2012. – 12 мая. – С. 4. - О сестринском персонале Дивинской участковой больницы.

# Юбілейныя даты ўстаноў адукацыі

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Кобрынскі раённы цэнтр дзіцячай творчасці» (1950) - 75 гадоў*

5 лістапада 1950 г. у невялікім аднапавярховым будынку адкрыты раённы Дом піянераў і школьнікаў. У трох класных пакоях працавала 4 гурткі дэкаратыўна-прыкладнай творчасці. У 1962 г. Дом піянераў і школьнікаў пераведзены ў былы клуб афіцэраў, вул. Леніна, 43. У 1990 г. Дом піянераў і школьнікаў быў перайменаваны ў Дом творчасці юных. У 2002 г. у сувязі з аб'яднаннем Кобрынскага гарадскога і раённага выканаўчых камітэтаў, адбываецца аб'яднанне гарадскога Дома творчасці юных і раённага Дома дзіцяча-юнацкай творчасці ў раённы цэнтр дзіцячай творчасці.

**Елизарова, Ж.** Архитекторы детских душ / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. — 2020. — 11 лістапада (№ 87). — С. 6 : фот. - Кобринский районный центр детского творчества отмечает 70-летний юбилей.

**Чэмер, М.** Цэнтр, вокны якога свецяцца дапазна / Мікола Чэмер // Настаўніцкая газета. - 2017. - 2 лістапада. - С. 12. - Кобрынскі раенны цэнтр дзіцячай творчасці часта называюць востравам творчасці і шчасця.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Дзівінскі дзіцячы дом» (1960) – 65 гадоў*

**Дзівінская агульна-адукацыйная школа-інтэрнат** была адкрыта ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў БССР № 659 ад 7 лістапада 1959 г. пасля рэарганізацыі Дзівінскага раёна. 5 сакавіка 1960 г. у школу прыбылі першыя 20 выхаванцаў. Гэты дзень лічыцца днём нараджэння школы, цяпер дзіцячага дома. 1 верасня 1997 г. школа рэарганізавана ў школу для дзяцей-сірот. 1 верасня 2009 г. УА «Дзівінская дзяржаўная школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, пакінутых без апекі бацькоў» была пераназвана ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Дзівінскі дзіцячы дом».

**Пашкович, Л. В**. Дом, который стал родным / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2020. — 11 сакавіка (№ 19). — С. 5 : фот. - Дивинский детский дом Кобринского района отметил 60-летний юбилей.

**Пашкович, Л.** Дом, где двери всегда открыты / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2017. - 27 мая. - С. 4. - В Дивинском детском доме прошел День открытых дверей.

**Петроченко, А.** Куда приходит детство / Анна Петроченко // Рэспубліка. - 2016. – 21 студзеня. - С. 9. - Сегодняшний день Дивинского детского дома.

**Аб узнагароджанні** Загадам Міністэрства адукацыі № 125 ад 30.09.2014 // Настаўніцкая газета. – 2014. – 4 кастрычніка. – С. 5. - В. П. Пікула, дырэктар ДУ«Дзівінскі дзіцячы дом» узнагароджана нагрудным знакам Міністэрства адукацыі «Выдатнік адукацыі».

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» (1910) - 115 гадоў*

Гісторыя школы як адукацыйнай установы пачынаецца з 1910 г. З 20 жніўня 1940 г. у будынку гімназіі адкрылася бясплатная сярэдняя школа, у якую прынялі адразу 120 вучняў. У гісторыі развіцця адукацыі школы пачаўся новы этап. Школьная адукацыя развівалася ва ўмовах савецкай сістэмы, рэформаў, але на ўсіх этапах школа была са статусам «сярэдняя».

**Самая** «першая» : інфармацыйна - бібліяграфічнае выданне да 110-годдзя з часу заснавання ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 1 г. Кобрына» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : Святлана Курачук. - Кобрын, 2020. – 44 с. фат. – (Адукацыя на Кобрыншчыне).

**Мельнік, Р.** Не страчваюць сувязі са школай / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік . - 2013. — 2 сакавіка. — С. 2. - Адміністрацыя і педагагічны калектыў СШ № 1 удастоены дыпломам другой ступені ў абласным конкурсе-аглядзе на лепшую ўстанову адукацыі па рабоце з ветэранамі.

**Белов, Д**. Школа № 1: история, судьбы, перспективы / Дмитрий Белов, Раиса Мокроус // Кобрынскі веснік. – 2010. – 30 кастрычніка. – С.4.

## *Дзяржаўнай установе адукацыі «Сярэдняя школа № 2 г. Кобрына» (1935) - 90 гадоў*

У 1935 г. быў уведзены ў эксплуатацыю асноўны корпус школы. Гэта была агульнаадукацыйная сямігадовая польская школа імя Пілсудскага для заможных гараджан, якая стала цэнтрам культуры ў працоўных ваколіцах ільнозавода. З 1946 г. школа стала агульнаадукацыйнай.

**Бакун, Е.** Учите языки / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. – 28 студзеня. - С. 2. - В ГУО «Средняя школа № 2 г. Кобрина» успешно используют в работе методику преподавания иностранного языка международного проекта «Erasmus+».

**Казакова, А.** Школа, сильная традициями / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. - 10 декабря. - С. 7. - Школа № 2 отпраздновала свой 80-летний юбилей.

**Тимошук, А.** Бесценна память поколений / Анна Тимошук // Кобрынскі веснік. - 2015.- 9 снежня. - С. 1, 2. - СШ № 2 г. Кобрина отметила свой 80-летний юбилей.

## *Дзяржаўнай установе адукацыі «Барысаўская пачатковая школа» (1900) - 125 гадоў*

Першая школа ў мікрараёне вёсак Магдалін, Барысава і Брылёва была адкрыта памешчыкам у 1900 г. Знаходзілася школа на тэрыторыі в. Магдалін. Будынак школы быў спалены падчас Першай сусветнай вайны. У пачатку 20-х гадоў адкрылася новая школа на тэрыторыі в. Барысава. У 1951-1952 гг. пабудавана новая школа ў в. Магдалін. У 1998 г. да школы былі дабудаваны 2 класныя пакоі і гульнёвая зала.

**Шевченко, А.** «Мы - поэты» // Кобрин-информ. - 2007. - 5 апреля. - С. 23. - Под таким названием в январе 2007 г. в издательстве «Родные просторы» г. Санкт-Петербург вышел сборник стихов учащихся Борисовской начальной школы Кобринского района.

## *Дзяржаўнай установе адукацыі «Залесская сярэдняя школа Кобрынскага раёна» (1950) – 75 гадоў*

У кастрычніку 1949 г. у в. Залессе быў пабудаваны новы будынак школы. З 1950-1951 навучальнага года Залеская школа стала сярэдняй. Першы выпуск з 14 навучэнцаў быў у 1952 г. У 2011 г. праведзены капітальны рамонт будынка школы.

**Белов, Д.** В мир знаний — в добрый путь! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2020. — 5 верасня (№ 69). — С. 3 : фот. - В Залесской средней школе Кобринского района открыт новый спортивный зал.

**Бялоў, Д.** З цудоўным настроем – у новую школу / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2011. – 3 верасня. – С. 2. - У в. Залессе – новая школа.

## *Дзяржаўнай установе адукацыі «Імянінская сярэдняя школа» (1905) - 120 гадоў*

Імянінская школа упершыню згадваецца ў Памятнай кніжцы Гродзенскага епархіяльнага вучылішчнага савета ў 1905 г. Гэта была аднакласная царкоўна-прыхадская школа, дзе навучалася 37 хлопчыкаў і 12 дзяўчынак. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны школу зачынілі, у 1944 г. была спалена. Пасля вайны ў 1947 г. школа была зноў адбудавана. 26 ліпеня 1964 г. было пачата будаўніцтва дадатковых чатырох класных пакояў. 14 лістапада 1965 г. будаўніцтва было здадзена ў эксплуатацыю. У 1968 г. разабралі старую школу, на яе месцы пабудавалі майстэрні. Калі школа разраслася да 180 вучняў, быў пабудавана новы будынак для пачатковых класаў. У 1977 г. дабудавалі некалькі новых класаў і заклалі спартыўную залу.

**Елизарова, Ж.** С днем рождения, школа! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 30 верасня (№ 76). — С. 4 : фот. - Именинской средней школе исполнилось 115 лет.

**Казакова, А.** Отдых с пользой для души / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2017. - 22 июня. - С. 2. - В ГУО «Именинская средняя школа» организован для учащихся палаточный лагерь с круглосуточным пребыванием.

**Магдысюк, С.** Век живи, век учись… / С. Магдысюк // Заря. – 2005. – 18 октября. – С. 3. - К 100-летию Именинской СШ.

## *Дзяржаўнай установе адукацыі «Лукская сярэдняя школа Кобрынскага раёна» (1975) - 50 гадоў*

Новая школа ў в. Лука прыняла дзяцей школьнага ўзросту ў 1975 г. Школа ажыццяўляе навучанне і выхаванне 89 навучэнцаў, маецца 11 класаў-камплектаў, працуе 23 педагога.

**Шпак, А.** Ориентирование — интеллектуальный спорт / Алла Шпак // Кобрынскі веснік. - 2017. - 4 лютага. - С. 4. - В Лукской средней школе прошли соревнования по спортивному ориентированию в закрытых помещениях.

## *Дзяржаўнай установе адукацыі «Гарадзецкая сярэдняя школа Кобрынскага раёна» (1900) – 125 гадоў*

У 1900 г. у Гарадцы была пабудавана пачатковая школа. Яна складалася з 4-х класаў, усяго займалася 65 чалавек. Працаваў адзін настаўнік. У канцы 1914 г. школа з пачатковай аднакласнай ператварылася ў двухкласную пачатковую. У 1947 г. школе прысвоены статус сярэдняй. У 2008 г. школа рэарганізавана ў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Гарадзецкі дзіцячы сад - сярэдняя школа». З 2022 г. – ДУ «Гарадзецкая сярэдняя школа Кобрынскага раёна».

**Елизарова, Ж.** Летописец городецкого края / Жанна Елизарова ; фото из архива Натальи Чижевской // Кобрынскі веснік. - 2020. — 12 жніўня (№ 62). — С. 6 : фот. - О ветеране педагогического труда ГУО «Городецкий детский сад-средняя школа» Г. П. Чижевской.

**Лесік, І.** Лёс, вызначаны дзяцінствам / Ірына Лесік // Кобрынскі веснік. – 2014. – 7 сакавіка. – С. 3. - Г. П. Чыжэўская 20 гадоў выкладае гісторыю ў Гарадзецкім садзе-сярэдняй школе.

**Хільчук, М.** Трайны юбілей / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2000. – 26 жніўня. – С. 2. - Адразу тры юбілеі адзначылі ў Гарадзецкай сярэдняй школе.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Павіццеўская сярэдняя школа» (1905) – 120 гадоў*

Першая школа на тэрыторыі в. Павіцце была адкрыта ў 1905 г. Гэта было аднакласнае народнае вучылішча, будынак якога знаходзілася недалёка ад будынка школы. У 1964 г. была пабудавана і адкрыта новая двухпавярховая школа. Для тых, хто працаваў і хацеў вучыцца, была адкрыта завочная школа. У 1990 г. было дабудавана новае крыло школы, дзе размешчана бібліятэка, кабінеты фізікі, геаграфіі, нямецкай мовы, інфарматыкі і іншыя кабінеты. У 1996 г. была прыбудавана майстэрня тэхнічнай і абслугоўваючай працы, частка якой у 2005 г. была пераабсталяваная пад дзіцячы сад. З 2022 г. перайменавана ў ДУА «Павіццеўская сярэдняя школа».

**Бакун, А.** З любоўю да роднай зямлі / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 15 студзеня (№ 3). — С. 6 : фат. - Павіццеўскі дзіцячы сад-сярэдняя школа — адна з самых прагрэсіўных устаноў адукацыі Кобрынскага раёна.

**Школа** обзавелась… детским садом // Заря. – 2006. – 14 января. – В. д. Повитье состоялось открытие нового детского сада, который будет работать при школе.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Дзіцячы сад № 2 г. Кобрына» (1990) – 35 гадоў*

Установа адкрыта ў 1990 г. Ва ўстанове функцыянуюць 10 груп.

**Пальто, К.** Вызывая детские улыбки / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2018. — 16 чэрвеня. — С. 4. - Увлекательно и интересно проходят мероприятия в детском саду № 2 г. Кобрина.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Дзіцячы сад № 7 г. Кобрына» (1970) – 55 гадоў*

Дзіцячы сад адкрыты ў 1970 г. У 2009 г. зроблены капітальны рамонт. Функцыянуе шэсць груп.

**Церахава, Н.** Запрашаем у дзіцячае турагенства «Кобрыншчына!» / Надзея Церахава // Настаўніцкая газета. - 2015. -12 снежня. - С. 22. - У яслях-садзе № 7 Кобрына адкрыта дзіцячае турыстычнае агенцтва "Кобрыншчына".

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Дзіцячы сад № 9 г. Кобрына» (1975) – 50 гадоў*

Яслі-сад адкрыты ў 1975 г. Рэканструяваны ў 1990 г. У 2005 г. адкрыта група для дзяцей з цяжкімі парушэннямі мовы. У 2006 г. адкрыта інтэграваная група для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

**Грышкевіч, С.** Чаму рыбы не жывуць у лужы? / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2016. - 31 сакавіка. - С. 22. - У абласным этапе Рэспубліканскага конкурсу даследчых работ дашкольнікаў сярод прызёраў былі выхаванцы яслі-сада № 9 г. Кобрына.

**Мароз, А.** Школа ранняга развіцця для дзяцей і іх бацькоў / Алена Мароз // Настаўніцкая газета. - 2015. - 20 студзеня. - С. 6. - У яслях-садзе № 9 Кобрына дзейнічае школа ранняга развіцця.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Буховіцкі дзіцячы сад» (1990) – 35 гадоў*

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Буховіцкія яслі-сад» функцыянуе з 1990 г. Да 1994 г. дашкольная ўстанова знаходзілася ў ведамаснай падпарадкаванасці калгаса «Перамога» (сучасная назва СВК «Пакроўскі»), у цяперашні час заснавальнік - Кобрынскі раённы выканаўчы камітэт.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Лукскі дзіцячы сад Кобрынскага раёна» (1975) – 50 гадоў*

Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Лукскія яслі-сад» функцыянуе з 1975 г. Працуе адна рознаўзроставая група, якую наведваюць 17 выхаванцаў.

# Юбілейныя даты ўстаноў культуры

### *Установе культуры «Кобрынскі Палац культуры» (1960) – 65 гадоў*

Гісторыя **Палаца культуры** пачынаецца з 2009 г., калі ў Кобрыне быў праведзены рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі». Да гэтага існаваў гарадскі Дом культуры, пабудаваны ў 1960 г. У 1980-я гг. ХХ ст. была праведзена яго рэканструкцыя, але мерапрыемствы рэспубліканскага маштабу не маглі праводзіцца ў старым будынку. Установа культуры «Кобрынскі Палац культуры» - вядучая ўстанова культуры і галоўная канцэртная пляцоўка Кобрыншчыны - пасля рэканструкцыі ўрачыста расчыніла свае дзверы ў 2009 г. Канчаткова пераехаўшы ў новы будынак пасля «Дажынак», у 2010 г. значна павялічылі колькасць калектываў. Цяпер іх 26, 13 з якіх маюць званне «народны» або «ўзорны».

**Кобрынскі** Палац культуры // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 4 . – С. 518-519.

**Пашковіч, Л.** Валянціна Пакалюк: «Палац – цэнтр культурнага жыцця» / Людміла Пашковіч ; фота Р. Мельніка // Кобрынскі веснік. – 2015. – 18 ліпеня. – С. 10. - У Палацы культуры Кобрына дзейнічае 26 калетываў, 13 з якіх маюць званне «народны» або «узорны».

## *Калектывы Кобрынскага Палаца культуры – юбіляры*

***Аркестр народных інструментаў*** створаны ў ***1975 г.*** У складзе калектыву выкладчыкі дзіцячай школы мастацтваў, усяго працуе 30 чалавек. Кіруе калектывам таленавіты музыкант Аляксандр Новік. Званне народнага прысвоена ў 1990 г.

***Тэатральная студыя «Рытм»*** створана ў ***1960 г.*** Першым рэжысёрам была М. К. Пячонкіна. У 1993 г. калектыў узначаліла В. М. Кірылюк. Званне ўзорнага прысвоена ў 1981 г.

***Шахматна-шашачны аматарскі клуб*** створаны ў ***1985 г***. З 1987 г. калектыў узначальвае Т. А. Сапега. Асноўныя задачы клуба - папулярызацыя шахмат і шашак сярод насельніцтва, развіццё творчага патэнцыялу, арганізацыя вольнага часу насельніцтва. Званне народнага прысвоена ў 1995 г.

**Пракапюк, А. Я.** Калектывы Кобрынскага гарадскога Дома культуры / А. Я. Пракапюк // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 505-606.

### *Народнае аматарскае літаратурнае аб'яднанне «Белы бусел» (2005) - 20 гадоў*

**Аматарскае літаратурнае аб'яднанне «Белы бусел**» было створана ў 2005 г. па ініцыятыве В. І. Паўзуна, урача-афтальмолага і вялікага аматара паэзіі. Праца вядзецца ў трох кірунках: садзейнічанне творчаму росту аўтараў і выканаўцаў, раскрыццё новых здольнасцей, культурна-асветніцкая работа. Цесныя творчыя адносіны склаліся ў удзельнікаў «Белага бусла» з супрацоўнікамі цэнтральнай раённай бібліятэкі. У 2010 г. выдадзены зборнік «Вдохновение», у які ўвайшлі творы 35 мясцовых паэтаў. Наогул, выдадзена 5 аўтарскіх зборнікаў вершаў, 2 - калектыўных: «Свет Великой Победы» і «Под крылом «Белого аиста». На сённяшні час кіруе аматарскім літаратурным аб'яднаннем

Л. І. Лазюк, філолаг па адукацыі, настаўнік вышэйшай катэгорыі. У красавіку 2014 г. калектыву за дасягнутыя поспехі ў развіцці аматарскай творчасці, якія адпавядаюць мастацкаму ўзроўню і творчым паказчыкам, папулярызацыі нацыянальных культурных каштоўнасцей, і актыўную канцэртную дзейнасць прысвоена званне народнага.

**Вдохновение** : сборник прозы и лирики Кобринщины / сост. Т. Н. Садовничек. – Брест: Альтернатива, 2010. – 336 с. - Вып. 1.

**Под** крылом «Белого аиста» : к 10-летию народного любительского объединения «Белый аист» / сост. и ред. Л. И. Лазюк. – Кобрин, 2015. – 122 с.

**Свет** Великой Победы / сост. и ред. Л. И. Лазюк. – Кобрин : Дворец культуры, 2015. - 44 с.

**Паэтычны** клуб «Белый аист» // Літаратурная карта Берасцейшчыны. – Брэст:, 2008. – С. 313-314. - Сборник стихов и песен о Великой Отечественной войне поэтов народного любительского объединения «Белый аист».

### *Харавы калектыў «Світанак» Дома культуры ААТ «Кобрынская сельгастэхніка» (1985) - 40 гадоў*

**Харавы калектыў «Світанак»** Дома культуры ААТ «Кобрынская сельгастэхніка» створаны ў 1985 г. Арганізатарам і кіраўніком яго ў 1985-1999 гг. была Г. П. Шчамялёва. З 2000 г. калектыў узначальвае Алеся Пахомікава. Званне народнага прысвоена ў 1999 г.

**П'янцава, В. В.** Харавы калектыў «Світанак» Дома культуры ААТ «Кобрынская сельгастэхніка» / В. В. П'янцава // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 508-509. - (Калектывы Кобрынскага раёна).

**Хільчук, М.** Час уздыму / М. Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1998. – 18 сакавіка. – С. 2. - Пра харавы калектыў ААТ «Кобрынская сельгастэхніка».

### *Хор «Залеская гамонка» («Залесачка») Залескага цэнтра культуры і вольнага часу(1980) - 45 гадоў*

**Хор «Залесачка» Залескага сельскага Дома культуры** створаны ў 1980 г. Яго першым хармайстрам была Клаўдзія Якаўчук. Пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 7 ліпеня 1993 г. хору прысвоена ганаровае званне «народны самадзейны калектыў». Калектыў неаднаразова быў удзельнікам і пераможцам фестываляў і аглядаў-конкурсаў. Са жніўня 2010 г. калектывам кіруе К. С. Кацёлка, выпускніца Брэсцкага музычнага каледжа. Акампаніятар А. М. Амельянчук. Калектыў разнастайны як па прафесійнаму, так і па ўзроставаму складу. У калектыве вядзецца сістэмная вучэбна-творчая і канцэртная дзейнасць, работа над павышэннем узроўня выканаўчага майстэрства.

**П'янцава, В. В.** Хор «Залесачка» Залескага сельскага Дома культуры / В В. П'янцава // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 509.

**Пашковіч, Л.** 25 гадоў са званнем «народны» / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2018. — 8 снежня. — С. 12.

**КРАЯЗНАЎЧЫ КАЛЯНДАР:**
**юбілейныя і памятныя даты Кобрынскага раёна**
**на 2025 год**

Інфармацыйнае выданне

Складальнік
Курачук Святлана Дзмітрыеўна

Камп’ютарная вёрстка С. Д. Курачук
Дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

На беларускай, рускай мовах

Надрукавана на камп’ютарна-выдавецкай сістэме
ДУК «Кобрынская раённая цэнтральная бібліятэчная сістэма»

225306 вул. Маршала Жукава, 12, г. Кобрын
Кобрынская раённая цэнтральная бібліятэчная сістэма
E-mail: kobrinlib@gmail.com